# «З замілаванасцю да роднай зямлі і роднага неба...»

***25 чэрвеня ў аграгарадку Цімкавічы Капыльскага раёна адбылося літаратурна-музычнае свята «Цімкавіцкія вытокі», прымеркаванае да дня нараджэння выдатнага беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага (1900 – 1944).***

Такая маштабная ініцыятыва ў гонар пісьменніка была арганізавана ўпершыню. Невыпадкова, што свята прайшло ў Цімкавічах, бо менавіта гэтае месца Кузьма Чорны лічыў сваёй радзімай, хоць і нарадзіўся ў вёсцы Боркі Слуцкага павета. У 1908 г. сям'я Раманоўскіх (сапраўднае імя Кузьмы Чорнага – Мікалай Раманоўскі) пераехала ў мястэчка Цімкавічы. Тут Мікалай скончыў двухкласнае народнае вучылішча. Ён добра маляваў, цягнуўся да музыкі, навучыўся іграць на балалайцы, фісгармоні і піяніна, спяваў разам з маці ў царкоўным хоры. Хлапчук захапляўся прыродай, у чым была заслуга і маці, і дзеда Міхала Парыбка, якія часта з дзецьмі хадзілі па родных мясцінах, гулялі ў Скіп'ёўскім лесе, слухалі, як «хвоі гавораць»...

Цімкавічы, родная прырода, гаворка і побыт аднавяскоўцаў значна паўплывалі на творчасць Кузьмы Чорнага, які падкрэсліваў: *«дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма»*, і адзначаў, што яму б *«на ўсё жыццё хапіла апісваць цімкаўцаў»*. Пад час навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ён захапляў сяброў сваімі яскравымі расповедамі пра Цімкавічы і землякоў. Паступова стала звычаем, што на перапынках або ўвечары на кватэры Раманоўскі разыгрываў вясёлыя сцэнкі, кшталту, «як два цімкаўцы сустрэліся». Пасля навучання ў семінарыі ён вярнуўся на радзіму, працаваў у аддзеле народнай асветы, настаўнічаў у школе.

Да нашага часу ў Цімкавічах захавалася хата, з якой маці Колі Раманоўскага Глікер'я (Гліцэра) Міхайлаўна выпраўляла яго ў шлях да навукі. Напрыканцы свайго жыцця пісьменнік узгадваў мілыя яго сэрцу Цімкавічы, вельмі хацеў пабачыць іх, верыў, што там *«у ціхім жыцці можна будзе ачуняць як мае быць і напісаць усе задуманыя раманы»*, але здзейсніць гэта ўжо не давялося: 22 лістапада 1944 г. Кузьмы Чорнага не стала.

Літаратурна-музычнае свята «Цімкавіцкія вытокі» – цудоўны прыклад ушанавання памяці пісьменніка. Яно было прасякнута тэмай родных каранёў, захавання любові да сваіх продкаў, землякоў, бацькоўскага дому. Вельмі душэўна і шчыра сучасныя цімкаўцы ставяцца да асобы Кузьмы Чорнага. Імя



*Кузьма Чорны. 1925 г. З фондаў БДАМЛіМ*

пісьменніка носіць мясцовая сярэдняя школа, працуе Літаратурны музей пісьменніка, штогод ладзяцца творчыя конкурсы, дзе юныя мастакі адлюстроўваюць эпізоды з твораў пісьменніка, малююць яго партрэты.




На адкрыцці свята выступілі яго арганізатары: прадстаўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Капыльскага раённага выканаўчага камітэта, грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Свой верш, прысвечаны Кузьме Чорнаму, прачытаў Віктар Шніп. За ім выступіў Навум Гальпяровіч.

Далей прайшло ўзнагароджанне юных мастакоў, удзельнікаў творчага конкурсу «Родныя мае мясціны...», якіх павіншавалі дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргей Усік і намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксей Чарота.

Літаратурнае свята праходзіла адначасова на некалькіх пляцоўках. На вуліцы Слуцкай можна было пагартаць кнігі з Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі і Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі, набыць памятны сувенір у мясцовых майстроў, паўдзельнічаць у майстар-класе па ткацтве, паслухаць выступленні літаратараў Капыльскага раёна і мясцовых музыкаў, натхніцца мастацкай творчасцю навучэнцаў Капыльскага раёна на выставе «Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма», паспытаць стравы беларускай кухні.

У Літаратурным музеі Кузьмы Чорнага пазнавальную экскурсію правяла яго загадчыца Людміла Ніжэвіч. Разам з маленькімі акцёрамі тэатральнай студыі «Іскрынка», што працуе пры музеі, яна не першы год ставіць сцэнкі па творах Кузьмы Чорнага.




*Вольга Радкевіч – загадчыца Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі*

Сёлета асаблівую цікавасць выклікала інсцэніроўка ранняга апавядання пісьменніка «Гузік».

У музеі прайшла прэзентацыя віртуальнай экспазіцыі «Ён чуў сэрца народа», якую падрыхтавала Нацыянальная бібліятэка Беларусі да 120-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага. Рэсурс створаны сумесна з партнёрамі ў межах вядомага ў краіне праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», прымеркаванага да 100-годдзя літаб'яднання «Маладняк». У віртуальнай экспазіцыі, прысвечанай Чорнаму, кожны карыстальнік можа пазнаёміцца з жыццём і творчасцю пісьменніка, не выходзячы з дома прачытаць прыжыццёвыя выданні яго твораў, сярод якіх апавяданні са зборнікаў «Срэбра жыцця» (1925), «Вераснёвыя ночы» (1929), аповесці «Вясна» (1931) і «Насцечка» (1941), раман «Трэцяе пакаленне» (1935), п'еса «Ірынка» (1947) і іншыя творы. Рэсурс знаёміць з поўнымі тэкстамі артыкулаў сучасных даследчыкаў творчасці пісьменніка, дае магчымасць убачыць шэраг яго фотаздымкаў з роднымі і сябрамі, фота фрагментаў з тэатральных спектакляў, што ставіліся па п'есах Чорнага на беларускай сцэне. Актыўны ўдзел у стварэнні віртуальнай экспазіцыі прымаў і Літаратурны музей Кузьмы Чорнага, дзякуючы якому былі далучаны матэрыялы з фондаў установы: фотаздымкі малюнкаў пісьменніка, яго асабістыя рэчы, напрыклад, паліто, самавар, абрус, вытканы маці празаіка. Будуць пазнавальнымі для наведвальнікаў віртуальнага праекта і матэрыялы пра ўшанаванне памяці пісьменніка, гэты раздзел пастаянна папаўняецца новай інфармацыяй пра разнастайныя ініцыятывы, што ладзяцца ў яго гонар.

Цудоўна, што ў такі цёплы чэрвеньскі дзень Кузьма Чорны аб'яднаў столькі зацікаўленых беларусаў, якія з пашанай ставяцца да нашай літаратуры, да імёнаў сваіх землякоў, да памяці сваіх продкаў і нашай агульнай культурнай спадчыны. Як казаў пісьменнік: «*...Поўніцца шчасцем чалавек са справядлівым сэрцам і замілаванасцю да роднай зямлі і роднага неба...*».

***Юлія АМОСАВА***
***Фотаздымкі Таццяны ЛАЎРЫК***



*Людміла Ніжэвіч праводзіць экскурсію па залах музея*



*Нацыянальная бібліятэка Беларусі прэзентуе віртуальную экспазіцыю, прысвечаную Кузьме Чорнаму*